ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА

# НЯХАЙ УСЁ ЛАДЗІЦЦА Ў ЖЫЦЦІ



Асобныя словы хочацца сказаць аб чалавеку, з якім давялося працаваць вельмі многім людзям у Міханавічах. **Аксана Ільінічна Пунінская** нядаўна прадстаўляла адміністрацыю сельскага Савета, а сёння зноў вярнулася ў роднае асяроддзе. Гэта адукаваны і высокакваліфікаваны спецыяліст, умелы і ініцыятыўны арганізатар, патрабавальны і прынцыповы кіраўнік.

Яшчэ ў студэнцкія гады яна зразумела, што прафесія бібліятэкара трымаецца на самадданай працы. Гэта выснова і стала той цаглінкай, з якой пачала яна будаваць сваю працоўную біяграфію. На практыцы праверыла і ўдасканаліла свае веды, што ў спалучэнні з такімі рысамі характару, як мэтанакіраванасць, рашучасць, сціпласць далі падставу вылучыць яе кандыдатуру на пасаду дырэктара галоўнага ў раёне Дома кнігі.

Аўтарытэт — не толькі сярод калег па працы і падначаленых. Павага, як да дэпутата мясцовага Савета, старшыні пярвічнай арганізацыі "Белая Русь". А яшчэ — выдатная гаспадыня. І гэта асаблівасць яе характару адразу кідаецца ў вочы. Нешта не так, — зробіць, падправіць. Неназойліва, без кпінаў.

Галоўнае ўсё ж у яе асобе — яна сапраўдная маці. Усю пяшчоту аддае сыну Яўгену, застаючыся для яго сябрам, дарадчыкам.

Калі выпадае шанц лішні раз адрасаваць такому чалавеку словы павагі, прызнання, гэта робіш з асаблівым задавальненнем. Калектыў Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, выкарыстоўваючы магчымасць з нагоды дня нараджэння, які днямі адзначыла Аксана Ільінічна, ад удзячных сэрцаў віншуе свайго дырэктара. Здароўя, аптымізму, дабрабыту, шмат новых ідэй і натхнення для іх здзяйснення жадае імянінніцы. Няхай усё ладзіцца ў жыцці!

Яна РУДЗЕНСКАЯ.

Прысталічча. – 2011. – 21 мая. - С.2.